ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 19 (542) | Субота, 28 мая 1983 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

## ЗА ВАЖКІ ЎКЛАД У ХАРЧОВУЮ ПРАГРАМУ

25 мая ў актавай зале адбыўся сход камсамольскага актыву універсітэта. Абмеркавана пытанне «Асабісты ўклад кожнага ў выкананне Харчовай праграмы — справа камсамольскага гонару».

З дакладам выступіў сакратар камітэта ЛКСМБ С. У. Аўсеенка.

Адбыліся ажыўленыя спрэчкі. У іх прынялі ўдзел: А. Шэвель — сакратар камсамольскага бюро гістфіла, М. Дзергачоў — начальнік штаба працоўных спраў фізічнага факультэта, А. Кавальчук — член камсамольскага бюро арганізацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў, І. Казімір — камандзір спецыялізаванага атрада жывёлаводаў «Сож» матэматычнага факультэта, Н. Самуйлік — член камітэта ЛКСМБ, студэнтка 5-га курса фізічнага факультэта.

У рабоце сходу прыняў удзел і выступіў прарэктар універсітэта А. І. Балтоўскі.

На сходзе прыняты павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы на прадстаячы трэці працоўны семестр.

Справаздачу аб сходзе камсамольскага актыву чытайце ў наступным нумары нашай газеты.

## АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКІ ПАРТЫЙНЫ СХОД

Учора ў актавай зале адбыўся адкрыты агульнауніверсітэцкі партыйны сход. Абмеркаваны задачы партыйнай арганізацыі і калектыву ГДУ, якія вынікаюць з пастановы бюро ГК КПБ ад 7 красавіка 1983 г. «Аб рабоце парткома і рэктарата Гомельскага дзяржаўнага універсітэта па падрыхтоўцы і выхаванню прафесарска-выкладчыцкіх кадраў, павышэнню іх грамадска-палітычнай актыўнасці ў святле патрабаванняў лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС». З дакладам выступіў сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

На сходзе заслухана інфармацыя намесніка сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце У. М. Калмыкова аб выкананні пастановы агульнауніверсітэцкага партыйнага сходу ад 15 кастрычніка 1982 г., на якім абмяркоўваліся задачы кафедр грамадскіх навук у святле XXVI з'езда КПСС, пастаноў партыі і ўрада.

Справаздача з учарашняга партыйнага сходу будзе надрукавана ў наступным нумары нашай газеты.

## СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў ПАРТГРУПАХ

Завяршаецца справаздачна-выбарная кампанія ў партыйных групах факультэтаў і структурных падраздзяленняў універсітэта. Камуністы падводзяць вынікі сваёй работы за прайшоўшы перыяд, адзначаюць дасягнутыя поспехі, указваюць на меўшыя месца недахопы з мэтай іх ухілення і забеспячэння больш высокіх паказчыкаў па ўсіх напрамках дзейнасці.

24 мая адбыўся справаздачна-выбарны сход партгрупы кафедры эканомікі працы. Заслуханы і актыўна абмеркаваны справаздачны даклад партгрупорга В. С. Каржова.

У рабоце сходу партгрупы прыняла ўдзел і выступіла першы сакратар Цэнтральнага РК КПБ, член ЦК КПБ Г. М. Кускова.

У гэты ж дзень адбыўся справаздачна - выбарны сход партгрупы кафедры філасофіі. Заслуханы і абмеркаваны справаздачны даклад партгрупорга В. С. Наважылава.

У рабоце сходу партгрупы прыняла ўдзел і выступіла інструктар аддзела прапаганды і агітацыі Цэнтральнага РК КПБ М. А. Беразоўская.

Партгрупоргамі на сходах выбраны: на кафедры эканомікі працы — В. С. Каржоў, на кафедры філасофіі — В. С. Наважылаў.

## У ПАРТКОМЕ

На гэтым тыдні ў сераду адбылося чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта. Разгледжаны вынікі вучобы ў сістэме партыйна-палітычнай і эканамічнай адукацыі універсітэта. Паведамленне зрабіў намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце У. М. Калмыкоў. Выступілі таксама сакратар парткома М. І. Старавойтаў і сакратары партыйных бюро.

Прынятая пастанова накіравана на далейшае ўдасканальванне і якаснае паляпшэнне марксісцка-ленінскай і эканамічнай адукацыі ў калектыве універсітэта.

Партыйны камітэт зацвердзіў камандзіраў і камісараў студэнцкіх атрадаў, састаў СБА «Дружба-83», разгледзеў некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## СЕСІЯ НАБІРАЕ ТЭМП

У кожным корпусе універсітэта пануе цяпер асаблівы настрой — хвалюючы. Гэта і зразумела: ідзе чарговае выпрабаванне на веды студэнтаў — залікова-экзаменацыйная сесія. Абыякавасці, недобрасумленнасці ў адносінах да сябе яна «не любіць». Праўда, не ўсе гэта чамусьці ўсвядомілі. Таму здараюцца прыкрыя зрывы і «правалы». Іх прычыны шукаць далёка не трэба — пропускі заняткаў, абыякавыя адносіны да вучобы і недастаткова строгі кантроль за дысцыплінай з боку куратараў, дэканатаў. Адсюль і адпаведныя вынікі — невысокі ўзровень паспяховасці ў час сесіі. Асабліва гэта датычыць геалагічнага факультэта, дзе сесія у асноўным завяршылася і вынікі яе — не зусім радасныя.

У разгары экзамены на эканамічным, біялагічным факультэтах, факультэце фізвыхавання.



НА ЗДЫМКУ: экзамен па гісторыі КПСС у студэнткі геафака прымае асістэнт кафедры гісторыі КПСС У. В. НЯМКЕВІЧ. Веды А. БОНДАРАВАЙ ён ацаніў вышэйшай адзнакай.



Трэцякурсніца эканамічнага факультэта спецыяльнасці «Эканоміка працы» Наталля Маханько добра вучыцца, паспяхова здае экзаменацыйныя сесіі. У яе заліковай кніжцы толькі дзве добрыя адзнакі, астатнія — «выдатна». Трывалыя веды паказвае Наташа і ў бягучую сесію. Так, на экзамене па планаванню народнай гаспадаркі, які прымаў в. а. загадчыка кафедры галіновых

*Заўтра — Дзень хіміка*

## СЛУЖЫЦЬ НАРОДУ

У рашэнні ключавых народна-гаспадарчых задач адно з вядучых месц належыць хіміі. Цяжка пераацаніць яе значэнне і ў вырашэнні Харчовай праграмы.

Хімія сёння — гэта багацейшая сыравінная база практычна для ўсіх галін прамысловасці. Ад наменклатуры і якасці хімічнай прадукцыі ў значнай меры залежыць тэхнічны ўзровень усіх галін народнай гаспадаркі, дабрабыт савецкага чалавека.

У рашэннях XXVI з'езда КПСС вызначаны і навукова абгрунтаваны план усебаковай хімізацыі сельскай гаспадаркі. Намечана і ажыццяўляецца грандыёзная праграма работ па расшырэнню магутнасцей прадпрыемстваў, якія выпускаюць мінеральныя ўгнаенні і хімічныя сродкі аховы раслін.

У развіцці прамысловасці мінеральных угнаенняў хімікі нашай краіны дасягнулі вялікіх поспехаў. Цяпер Савецкі Саюз трывала ўтрымлівае першае месца ў свеце па іх вытворчасці.

Адначасова з павелічэннем пастаянна пашыраецца асартымент прадукцыі з палепшанымі фізічнымі ўласцівасцямі і павялічаным утрыманнем пажыўных рэчываў. Так, з 1980 г. мінеральныя ўгнаенні пастаўляюцца сельскай гаспадарцы ў асноўным у выглядзе гранул, што дае магчымасць лягчэй іх перавозіць і захоўваць.

Вялікі ўклад хіміі ў развіццё розных галін сучаснай тэхнікі. Гэта матэрыялы для квантавай электронікі, люмінафоры, якія валодаюць высокай манахраматычнасцю свячэння, хімічнай стойкасцю, цвёрдыя электраліты, высокаэфектыўныя каталізатары і мацнейшыя акісляльнікі.

Развіццё ўсіх галін хімічнай індустрыі цесна звязана з тэхнічным узроўнем хімічнага машынабудавання, у прыватнасці, з выпускам новых відаў машын для сельскай гаспадаркі і павышэннем іх працаздольнасці. Супрацоўнікі кафедры хіміі сумесна з праблемнай навукова-даследчай лабараторыяй фізіка-хімічных працэсаў трэння універсітэта ў гэтым годзе прыняла ўдзел у рашэнні задач, звязаных з павышэннем даўгавечнасці і працаздольнасці вузлоў трэння ў машынах і механізмах. Распрацаваны прапановы для Дзяржплана БССР па выкарыстанню звышпластычных сплаваў у вузлах трэння камбайна КСК-100, які выпускаецца вытворчым аб'яднаннем «Гомсельмаш».

Рэалізацыя гэтых прапаноў дазволіць істотна палепшыць якасць і прадоўжыць тэрмін службы камбайна.

Выкладчыкі кафедры хіміі сумесна з фізічным факультэтам праводзяць работы, якія даюць магчымасць навукова-абгрунтаванага падыходу да рашэння праблем сельскай гаспадаркі. У прыватнасці, сумесная іх дзейнасць дазваляе рэгуляваць уносімыя мікраўгнаенні і ўлічваць уплыў, накапленне і размеркаванне іх у раслінах.

Ахова навакольнага асяроддзя — адна з самых актуальных праблем нашага стагоддзя. У нашай краіне пытанні рацыянальнага выкарыстання і аховы глеб, недраў, расліннага і жывёльнага свету, паветранага і воднага басейна — знаходзяцца ў пастаянным полі зроку партыі і ўрада. Хімікі нашага універсітэта таксама ўносяць пэўны ўклад у вырашэнне гэтай задачы. Імі вядуцца работы па вызначэнню мікраэлементнага саставу прамысловых і прыродных аб'ектаў, што можа быць выкарыстана пры распрацоўцы праблем, звязаных з аховай навакольнага асяроддзя.

**У. ЛАЗБЕНЬ,**
**старшы выкладчык кафедры хіміі.**

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта, кафедра АМАЭІ горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры БАГДАНАВА Міхаіла Іванавіча з выпадку паспяховай абароны дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.

* * *

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта, кафедра АМАЭІ горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ГРОМАВА Віктара Іванавіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.

## ХРОНІКА

*Палітычны залік*

# НОВАЯ ФОРМА РАБОТЫ

На гісторыка-філалагічным факультэце, як і ў іншых пярвічных камсамольскіх арганізацыях універсітэта, прайшоў палітычны залік — новая форма ідэйна-палітычнай работы, распрацаваная камітэтам камсамола ГДУ.

Новае заўсёды выклікае шмат спрэчак, сумненняў. Не абышлося без іх і на гэты раз. Трэба адзначыць, што камсамольцы факультэта аднесліся да палітзаліку сур'ёзна, рыхтаваліся да яго з усёй адказнасцю.

Ідэйная накіраванасць камсамольскай работы на факультэце, якую ўзначальвае студэнт 3-га курса В. Лютынскі, знаходзіцца ў цэлым на высокім узроўні, што пацвердзіў і палітычны залік. Гэта і зразумела: нашы студэнты —будучыя гісторыкі і філолагі. Ім прымаць непасрэдны, прафесіянальны ўдзел у грамадска-палітычнай дзейнасці. На факультэце стала традыцыяй праводзіць мітынгі, прысвечаныя Міжнароднаму дню салідарнасці моладзі, многія камсамольцы другога курса з'яўляюцца слухачамі школы маладога лектара факультэта грамадскіх прафесій, каторыя — актыўныя члены універсітэцкага КІДа «Саюз». Удасканальваецца работа ініцыятыўнай групы па напісанню Летапісу народнай славы, сёлета пачата вывучэнне гісторыі Гомельскага кандытарскага аб'яднання «Спартак». У час трэцяга працоўнага семестра другакурснікі будуць працаваць у саставе інтэрнацыянальнага атрада «Дружба-83». Такім чынам, у грамадска-палітычнай рабоце прымаюць удзел многія нашы студэнты. А ці заўсёды гэты актыў выкарыстоўваецца ў поўнай меры?

Самая распаўсюджаная форма ідэалагічнай работы — палітзаняткі. Здараецца, што яны праводзяцца не на належным узроўні. Выступаючыя толькі знаёмяць слухачоў з міжнароднымі падзеямі, не выказваючы да іх сваіх адносін, не звязваючы іх з агульным становішчам у свеце, і не робячы вывадаў. Аднак у наш час кожны мае неабмежаваны доступ да сродкаў масавай інфармацыі, і, натуральна, пераказ газетных паведамленняў не можа выклікаць цікавасці ў аўдыторыі, тым больш — студэнтаў-гісторыкаў і філолагаў. Або яшчэ кажуць, што пры сучаснай інфармаванасці цяжка зацікавіць чым-небудзь слухачоў на палітінфармацыях. У такіх умовах узрастае роля палітінфарматара. Яму неабходна весці гутарку так, каб у прысутных узнікла цікавасць да разглядаемых пытанняў, каб усе імкнуліся прааналізаваць абмяркоўваемую падзею, зрабіць свае вывады. У выступленнях, падрыхтоўка да якіх звычайна даручаецца загадзя, вялікую ролю адыгрываюць пераканаўчыя факты і аргументы, падабраныя дакладчыкам з розных крыніц. Неабходна шырэй выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі, карты, табліцы, якія ёсць на кафедрах. На думку палітінфарматара групы Г-21 Д. Цалка, варта было б арганізаваць для ідэйна-палітычнага актыву праслухоўванне выступленняў вопытных лектараў з абласнога Дома палітасветы.

Не пасіўная прысутнасць на дакладах, якія чытаюцца па канспекту, а актыўнае абмеркаванне разглядаемых пытанняў усімі прысутнымі, дыспут, выказванне свайго пункту гледжання — такімі павінны быць палітзаняткі, асабліва тэматычныя. Так лічаць многія камсамольцы груп і адказныя за ідэйна-палітычную работу. Неабходна толькі наладзіць такую пастаноўку справы. Акрамя гэтага, трэба па магчымасці поўнасцю выключыць такія выпадкі, калі на час, адведзены для палітзаняткаў, накладваюцца іншыя мерапрыемствы — розныя заняткі, залікі, рэпетыцыі і г. д.

Правільная пастаноўка ідэйна-палітычнай работы ўплывае і на агульную дзейнасць групы, актыўнасць яе студэнтаў. Так, ніколі не застаецца ў баку ад абмяркоўваемых на сходах пытанняў прафорг групы Г-21 М. Бажко. Актыўная пазіцыя кожнага студэнта адлюстроўваецца на здольнасці ўсяго калектыву выканаць пастаўленыя перад ім задачы. У гэтым сэнсе добра зарэкамендавала сябе група Р-21, камсоргам якой з'яўляецца Ю. Падкуркаў.

Палітычны залік на гісторыка-філалагічным факультэце прайшоў паспяхова, павысіў цікавасць камсамольцаў да палітычных ведаў. Аднак, на наш погляд, многае ў яго правядзенні патрабуе дапрацоўкі. Больш дакладнай павінна быць арганізацыя камсамольскіх бюро. Трэба зрабіць больш змястоўнымі пытанні палітзаліку, зацвярджаць і распаўсюджваць іх загадзя. Многія студэнты адзначалі, што пытанні, якія задаваліся членамі камісіі, былі на ўзроўні ведаў сярэдняй школы і не прапаноўвалі, такім чынам, творчага пошуку студэнтамі правільных адказаў. Таму неабходную дапамогу студэнтам у складанні пытанняў да палітзаліку трэба аказаць выкладчыкам кафедр грамадскіх навук.

На апошнім сходзе камсамольскага актыву універсітэта абмяркоўвалася прапанова — уносіць адзнаку аб здачы палітзаліку ў залікоквую кніжку студэнта. На думку большасці камсамольцаў, гэта немэтазгодна, таму што грамадска-палітычная дзейнасць павінна быць маральна ўсвядомленай неабходнасцю, а не дыктавацца жаданнем атрымаць запіс у залікоўцы.

У цэлым палітычны залік — якасна новы і неабходны этап у падрыхтоўцы да грамадска-палітычнай атэстацыі. Таму трэба рабіць усё для таго, каб ён стаў традыцыйным.

**Т. МАСЛЮКОЎ,**
**член камсамольскага бюро 2-га курса гістфіла, студэнт групы Г-21.**

*У народных універсітэтах*

## ПРЫРОДА—ТВОРЦА ЦУДОЎНАГА

У аўдыторыі завешаны шторы. Запалены свечкі. На стэндах — мноства цудоўных ілюстрацый, рэпрадукцый з карцін вядомых рускіх і савецкіх мастакоў-пейзажыстаў...

У такой абстаноўцы ў народным універсітэце маральна-эстэтычнага выхавання праходзіў нядаўна вечар першакурснікаў біялагічнага факультэта «Прырода — творца цудоўнага», падрыхтаваны камсамольцамі групы Б-11 сумесна з бібліятэкай універсітэта. Вечар адкрыла старшыня савета народнага універсітэта на біяфаку Н. Калеснікава.

Вядучая вечара Ірына Кудравец задушэўна, лірычна вяла расказ аб прыродзе як крыніцы ўсяго самага цудоўнага на зямлі. Аб Радзіме, любві да прыроды чыталі вершы студэнты В. Фясюк, Т. Кайдунова, А. Жагулкін.

Рускай бярозцы — сімвалу Расіі — прысвяціў свой верш студэнт 1-га курса, камсорг групы Б-11 С. Ярмак. Аб прыродзе — крыніцы радасці людской, лепшых пачуццяў чалавека чыталі вершы С. Ясеніна і М. Рубцова студэнты А. Доўжык, Ж. Дамасевіч, Т. Радзькова, А. Бондараў, А. Целяпнёва.

У зале гучала музыка П. І. Чайкоўскага, народжаная вялікай любоўю кампазітара да роднай прыроды. Студэнтка В. Кулыба пазнаёміла з творчасцю І. Левітана, вялікага і мудрага майстра рускага пейзажа. Цудоўнае выкананне вершаў, лірычнае гучанне музыкі дапаўнялі маляўнічыя слайды аб прыродзе.

Але ў наш час нельга бачыць у прыродзе толькі крыніцу духоўнага ўзбагачэння. Мы павінны памятаць і аб небяспецы, якая навісла над прыродай, — пагрозе яе знішчэння. Таму так трывожна гаварыла студэнтка З. Скачкова пра віды жывёл і птушак, якія ўжо не сустракаюцца ў прыродзе. З вялікай цікавасцю прагледзелі ўдзельнікі вечара слайды аб рэдкіх відах жывёл і птушак, паказаныя дацэнтам кафедры хіміі А. Я. Малахавай.

На вечары выступіла К. Р. Дарашэнка з гарадскога таварыства аховы прыроды. Яна заклікала студэнтаў берагчы прыроду, выхоўваць у людзей ашчадныя адносіны да яе і ўручыла ўдзельнікам вечара сувеніры.

З добрымі пажаданнямі першакурснікам паспяхова працягваць такія цікавыя і карысныя заняткі ў народным універсітэце выступілі на вечары куратар групы Б-11 А. Н. Баравікова, сакратар камітэта камсамола універсітэта С. У. Аўсеенка.

**Н. КАПШАЙ,**
**бібліятэкар ГДУ.**

## ІНТЭРНАТАМ — УЗОРНЫ ПАРАДАК І ДЫСЦЫПЛІНУ

На пасяджэнні Савета пры парткоме па рабоце ў інтэрнатах, якое адбылося на мінулым тыдні, разгледжаны пытанні аб выкананні загада рэктара універсітэта аб прапускной сістэме, захаванні правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах, аб іх засяленні ў новым навучальным годзе.

З паведамленнямі па гэтых пытаннях на Савеце выступілі памочнік прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце М. П. Шкарбун, старшыня студэнцкага прафкома Н. І. Колтышава, старшыня Савета па рабоце ў інтэрнатах, дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі Л. Н. Сечка.

У рабоце Савета прынялі ўдзел сакратар парткома М. І. Старавойтаў, прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў, дэканы факультэтаў, куратары, старшыні студсаветаў, каменданты інтэрнатаў.

Вырашана правесці да канца мая сходы на факультэтах з мэтай растлумачэння студэнтам загада рэктара аб інтэрнатах.

## КАБ НЕ ГАНЬБІЛІ ГОНАР УНІВЕРСІТЭТА

28 красавіка бягучага года рэктарам універсітэта быў выдадзены загад аб захаванні студэнтамі правіл сацыялістычнага агульнажыцця ў інтэрнатах. Аднак В. Зарэцкі, Ю. Самарын і А. Папоў з гр. Т-43 эканамічнага факультэта ігнаравалі гэты загад. У ходзе праверак было выяўлена, што яны неаднаразова арганізоўвалі ў інтэрнаце калектыўныя п'янкі, на якія запрашалі пабочных асоб.

Распараджэннем дэкана эканамічнага факультэта ад 17 мая 1983 г. па ўзгадненню са студэнцкім прафкомам названыя студэнты выселены з інтэрната. Яны папярэджаны аб недапушчэнні парушэння вучэбнай дысцыпліны і правіл паводзін у грамадскіх месцах, у адваротным выпадку будуць выключаны з універсітэта.

За амаральныя паводзіны В. Зарэцкі вызвалены ад абавязкаў старасты гр. Т-43.



**На здымку: лабаранты кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі геалагічнага факультэта В. А. Мікуліч і М. Ф. Краўчанка (на пярэднім плане) рашаюць задачы на гідраінтэгратары ў лабараторыі дынамікі падземных вод.**

**Фота К. Дзмітэркі.**

## ПАХОД У ПАРТЫЗАНСКУЮ «КРЫНІЧКУ»

У кожным раёне ёсць мясціны, звязаныя з баявымі подзвігамі савецкіх людзей. На Гомельшчыне такой з'яўляецца «Крынічка», што непадалёку ад Чонак. Тут зараджаўся партызанскі рух. І ўжо стала традыцыяй, што першакурснікі нашага універсітэта кожнай вясной робяць сюды паходы, каб аддаць даніну павагі тым, хто мужна змагаўся за сённяшні шчаслівы дзень.

Вялікае ўражанне засталося ад паходу і ў яго сёлетніх удзельнікаў. З цікавым расказам перад імі выступіў супрацоўнік кафедры фізічнага выхавання палкоўнік запасу А. А. Косцікаў. За гэта яму быў уручаны памятны падарунак.

Ускладзеныя на святую зямлю вянкі сталі глыбокім прызнаннем студэнцкай моладзі загінуўшым барацьбітам за вызваленне нашай Радзімы.

